**Я.Д.Грыгаровіч**, *прафесар*

# СТРУКТУРНА-ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВА ЎСТАНОВАХ КУЛЬТУРЫ

Падрыхтоўка сучаснага спецыяліста да працы ў сферы культуры ажыццяўляецца на аснове дзейнаснага падыходу, які прадугледжвае фарміраванне ў студэнтаў уменняў і навыкаў ажыццяўлення розных відаў дзейнасці. Рэалізацыя гэтага прынцыпу павінна праcочвацца ў змесце агульнанавуковых, псіхолага-педагагічных і спецыяльных дысцыплін, у метадычным забеспячэнні якаснага засваення студэнтамі ведаў, ва ўзбраенні галіновымі методыкамі, што і дазволіць падрыхтаваць іх да вядзення разнастайных формаў арганізацыйнай і выхаваўчай работы, да выкарыстання атрыманых ведаў пры выкананні прафесійных абавязкаў.

Дзейнасць як форма выяўлення сутнасных сіл чалавека, аснова чалавечага быцця, характарыстыка пэўнага тыпу адносін да свету вызначае і сацыяльную актыўнасць асобы. У сваю чаргу сацыяльная актыўнасць выяўляецца праз дзейнасць, характарызуецца ёю, у выніку чаго сама дзейнасць становіцца праяўленнем актыўнасці, надаючы ёй прадметную накіраванасць, паслядоўнасць, сістэмнасць.

*Сацыякультурная дзейнасць* як сацыяльна арыентаваная работа чалавека па выяўленні, захаванні, пашырэнні, асваенні і трансляцыі культурных каштоўнасцей, назапашаных пэўным грамадствам ці асобай, канцэнтруецца ў асноўным у пазавучэбнай, пазапрацоўнай сферы, у вольным часе чалавека. Гэта дзейнасць мае добраахвотны характар, адзначаецца свабодай выбару і ініцыятыўнасцю асобы або групы (сацыяльнай, прафесійнай, рэкрэацыйнай), характарызуецца глыбокай асобаснай накіраванасцю, індывідуальнасцю, вызначаемай біялагічнымі і сацыяльнымі патрэбнасцямі чалавека.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сацыякультурная дзейнасць з'яўляецца самастойнай падсістэмай сацыялізацыі асобы, сацыяльнага выхавання і адукацыі чалавека. Сацыялізацыя як працэс асваення асобай сацыяльнага вопыту, уключэння яе ў сістэму грамадскіх адносін патрабуе мэтанакіраваных намаганняў грамадства і яго інстытутаў па фарміраванні гэтай асобы.

Працэс сацыялізацыі дэтэрмінаваны канкрэтным грамадствам, часам, канкрэтнай культурна-гістарычнай сітуацыяй і прадугледжвае ўключэнне чалавека ў пэўны соцыум, асваенне і ўзнаўленне ім сацыяльнага вопыту дадзенага грамадства, прыняцце патрабаванняў, нормаў і прынцыпаў грамадскіх адносін. У працэсе гэтага ўключэння фарміруюцца асноўныя каштоўнасці і арыентацыі, устаноўкі і матывы, перакананні, маральныя, грамадзянскія, эстэтычныя і іншыя якасці асобы. У гэтым заключаецца вялікае значэнне сацыякультурнай дзейнасці ў развіцці асобы на працягу ўсяго жыцця.

Пры дапамозе адукацыі і выхавання культура як сістэмная сукупнасць матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, створаных чалавецтвам у працэсе яго гістарычнага развіцця, перадаецца ад пакалення да пакалення, дзякуючы ўключэнню індывіда ў сацыякультурны асяродак, у сацыяльнае жыццё. Такім чынам чалавек становіцца не толькі часткай грамадства, але і асобай, індывідуальнасцю, якая нясе ў сабе засвоеную культуру і гатова трансліраваць яе наступнаму пакаленню. Вельмі важна, што, засвойваючы гэты вопыт, чалавек фарміруе ўласнае “Я”, якое адрозніваецца ад іншых, але адэкватнае гісторыка-культурнай фармацыі, у якой ён жыве. Як трапна заўважыў вядомы расійскі вучоны М.А.Арыярскі, задача не ў тым, каб чалавек проста назапасіў у сабе ўсе багацці культуры, а ў тым, «каб ён атаясамліваў сваё “Я” са зместам культуры, зліў з яе жыццём сваё жыццё, з яе мэтамі свае мэты і тым самым зрабіў сэнсам сваёй жыццядзейнасці ўсё сапраўды чалавечае ў чалавеку» [1, с.129].

Аднак працэс назапашвання сацыякультурнага вопыту не абмяжоўваецца дзяцінствам і юнацтвам. У сучасных умовах знач-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нага ўскладнення грамадскага жыцця, росту патоку інфармацыі і ўзнікнення новых тыпаў рэальнасці развіццё і сацыялізацыя асобы працягваюцца ўсё жыццё. Прычым дзяцінства і юнацтва не з'яўляюцца падрыхтоўчымі этапамі да спасціжэння культуры: з самага ранняга ўзросту дзіця не толькі аб'ект, але і суб'ект функцыянавання культуры. Эфектыўнасць гэтага працэсу ў многім залежыць ад таго, наколькі ён мэтанакіравана арганізаваны і кірусмы, карэктна скіраваны, метадычна прадуманы, таму роля педагога, у дадзеным выпадку сацыяльнага педагога, з'яўляецца вызначальнай.

Правесці мяжу паміж культурнай і сацыяльнай дзейнасцю чалавека даволі цяжка, таму што ўсякая культурная дзейнасць мае сацыяльны аспект і наадварот. Узаемасувязь паняццяў, непарыўнас адзінства, узаемадапаўняльнасць і падабенства вынікаў дазваляюць гаварыць аб асобай накіраванасці суб'екта сацыякультурнай дзейнасці – спажыванні, асваенні, развіцці, стварэнні культурных каштоўнасцей дзеля і ў імя іншых людзей, наступных пакаленняў, нацыі, грамадства. Гаворка ідзе хутчэй аб суадносінах і аб'ёме гэтых паняццяў у канкрэтнай дзейнасці: у сацыяльнай дамінуюць арганізацыйна-кіруючы і эканамічны аспекты, у культурнай – ідэі, сімвалы, тэорыі, нормы, каштоўнасці, ідэалы – усё, што абазначаецца паняццем "духоўная культура".

З'яўляючыся пераемнікам тэрміна "культурна-асветніцкая работа", сацыякультурная дзейнасць па сутнасці прынцыпова адрозніваецца ад яе. Культурна-асветніцкая работа як састаўная частка работы ідэалагічнай разглядала чалавека або групу людзей, а часцей "увесь савецкі народ" у якасці аб'екта выхаваўчых уздзеянняў дзяржавы і прыналежных дзяржаве грамадскіх аб'яднанняў (прафсаюза, камсамола, партыі) з мэтай іх адукацыі, выхавання чалавека "светлага камуністычнага будучага". Лічылася, што чалавек, з'яўляючыся шрубкай дзяржаўнай машыны, мае патрэбу ў такім уздзеянні, успрымае і прымае яго, фарміруецца адпаведна ўзору – камуністычнаму ідэалу. Прынцып аб'ект-суб'ектных адносін прадвызначыў змест культурна-асветніцкай работы амаль

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на восемдзесят гадоў, ён вызначыў і методыку, і формы арганізацыі такой работы.

З атрыманнем суверэнітэту і развіццём дэмакратычных тэндэнцый у грамадстве сфера культуры значна раней за іншыя змяніла арыенціры, адмовіўшыся ад аб`ектна-суб`ектнай мадэлі на карысць суб`ект-суб`ектнай, паставіла ў цэнтр сваёй дзейнасці чалавека як вышэйшую грамадскую каштоўнасць, яго інтарэсы, патрэбнасці, каштоўнасныя арыентацыі, зрабіла яго ўдзельнікам стваральнай культурнай дзейнасці. Дзяржава заклікана толькі стымуляваць самаарганізацыю сацыякультурнай дзейнасці і самаразвіццё культуры шляхам прававой, эканамічнай, арганізацыйнай і іншай падтрымкі культуры. Яна павінна ўзяць на сябе стварэнне адпаведнай сённяшняму дню інфраструктуры сацыякультурнай сферы, спрыяльнага культурнага асяроддзя, умоў для рэалізацыі дамінуючых духоўных патрэбнасцей чалавека.

Сэнс дзейнасці ўстаноў культуры заключаецца ў стварэнні ўмоў для самарэалізацыі асобы, задавальнення яе эстэтычных, камунікатыўных, рэкрэацыйных, творчых і іншых патрэбнасцей, г.зн., у адпаведнасці з дакладным выказваннем А.Д.Жаркова, "чалавек служыць адначасова і аб`ектам культурна-адпачынкавай дзейнасці, сродкам і вынікам развіцця асобы" [2, с.17]. Установы культуры ўсіх формаў уласнасці заклікаsucc накіроўваць свае намаганні на стварэнне, развіццё, распаўсюджанне культурных каштоўнасцей, арганізацыю змястоўных зносін і разумнай рэкрэацыі насельніцтва, адпачынку чалавека і ўзнаўлення сіл, забяспечваць распаўсюджванне духоўна-культурных каштоўнасцей, іх актыўнае, творчае асваенне людзьмі ў сферы вольнага часу з мэтай фарміравання гарманічна развітой, творча актыўнай асобы. Нельга пры гэтым не адзначыць і неабходнасць пазітыўнага ўздзеяння на чалавека, групу, грамадства з мэтай выхавання ў іх гуманістычнага светапогляду, дэмакратычных ідэалаў, разумення і прытрымлівання агульначалавечых каштоўнасцей і нацыянальных традыцый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Інакш кажучы, арганізацыя сацыякультурнай дзейнасці – гэта працэс стварэння ўмоў для матываванага выбару асобай прадметнай дзейнасці ў залежнасці ад яе інтарэсаў і патрэбнасцей, дзейнасці, якая спрыяе засваенню, захаванню, развіццю і распаўсюджванню духоўна-культурных каштоўнасцей.

Карэкціроўка зместу і накіраванасці сацыякультурнай дзейнасці, новая сацыякультурная сітуацыя, значныя мэтамяркуемыя змены ў палітычным і эканамічным жыцці грамадства, развіццё працэсаў гуманізацыі і гуманітарызацыі выклікалі істотную трансфармацыю тэорыі сацыякультурнай дзейнасці. Вялікі ўклад у яе развіццё ўнеслі вядучыя вучоныя маскоўскай школы прыкладной культуралогіі Н.К.Бакланава, А.Ф.Валовік, А.Д.Жаркоў, Т.Р.Кісялёва, Ю.Д.Красільнікаў, В.С.Садоўская, Ю.А.Стральцоў, В.Н.Чыжыкаў і іншыя, сфармуляваўшы новую парадыгму сацыякультурнай дзейнасці. Яна будуецца на прынцыпах прыярытэту агульначалавечых інтарэсаў над класава-саслоўнымі ў працэсе асваення духоўных і маральных каштоўнасцей; усеагульнай масавай культуратворчасці, самаарганізацыі, самасцвярджэння асобы як дамінуючай прыметы; гуманізацыі зместу і ўсяго выхаваўчага патэнцыялу, іх усёабдымнага падпарадкавання інтарэсам, патрэбнасцям і ўстаноўкам асобы; дыялектычнага адзінства і пераемнасці культурна-гістарычнага, сацыяльна-педагагічнага і нацыянальна-этнічнага вопыту, традыцый і інавацый; грамадска-дзяржаўнага сукіравання сацыякультурнай дзейнасцю, забеспячэння дэцэнтралізацыі і суверэннасці рэгіянальнай палітыкі ў сацыякультурнай сферы [3, с.22].

Названае варта было б дапоўніць прынцыпамі дабравольнасці і даступнасці сацыякультурнай дзейнасці, ініцыятывы і самадзейнасці яе суб'ектаў, пераемнасці і паслядоўнасці далучэння чалавека да свету культуры, адзінства інфармацыйна-лагічнага і эмацыянальна-вобразнага ўздзеяння на свядомасць і паводзіны чалавека, дыферэнцыраванага падыходу да асобы і іншымі, што падкрэслівае спецыфічныя асаблівасці гэтай важнейшай формы сацыяльнай палітыкі.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

Сучасная трактоўка прынцыпаў патрабуе значных змен у ідэалогіі культурнай дзейнасці, павароту культурных устаноў да запатрабаванняў канкрэтнай асобы, а не "народных мас", гуманізацыі ўсяго працэсу арганізацыі работы, пераадолення дагматызму, неапраўданай катэгарычнасці ў ацэнках грамадскага жыцця, праяўлення памяркоўнасці, павагі да думкі меншасці, умення слухаць іншых і быць пачутым імі. Сацыякультурныя інстытуты становяцца ў гэтым выпадку носьбітамі і праваднікамі гуманістычных ідэй, захавальнікамі нацыянальнай культуры, народных традыцый, актуалізатарамі нацыянальных формаў традыцыйнай культуры і агульначалавечых каштоўнасцей, стымулятарамі нацыянальнага самавызначэння чалавека.

Метадалагічнае значэнне мае пытанне аб функцыях сацыякультурнай дзейнасці, якія, уласна кажучы, і вызначаюць спецыфіку, мэты і сродкі дасягнення мэт у працэсе кіравання сацыякультурнай дзейнасцю. Новая сацыякультурная сітуацыя патрабуе больш грунтоўнага і адначасова гнуткага падыходу да вызначэння функцый сацыякультурнай дзейнасці як формы грамадскай практыкі, якія забяспечваюць рэалізацыю выхаваўчых мэт і задач, эфектыўнасць механізмаў засваення і стварэння культуры. Адначасова іх можна разглядаць у якасці пэўнага крытэрыю ацэнкі сацыякультурных працэсаў, эфектыўнасці работы інстытутаў па арганізацыі вольнага часу, выніковасці выхаваўчага ўздзеяння на асобу. Паспрабуем намеціць асноўныя, самыя важныя з іх, тыя, якія вызначаюць якасць сацыякультурнай дзейнасці.

*Адаптацыйная.* Яна заключаецца ў неабходнасці ўключэння асобы ў сістэму сацыяльных камунікацый з мэтай засваення чалавекам асноў грамадскай і асабістай культуры, патрэбных яму для адаптацыі ў соцыуме, набыцця здольнасці да самарэгуляцыі (маюцца на ўвазе культура паводзін, патрабуемыя для жыццядзейнасці маральныя і эстэтычныя якасці, культура мовы, быту і іншыя сацыяльныя першасныя якасці).

*Развіццёвая* функцыя патрабуе ад педагога кіравання паступальным пазітыўным змяненнем псіхічных якасцей асобы, неаб-

ходных для камфортнага існавання ў соцыуме: інтэлектуальнай, эмацыянальнай і валявой сфер, эстэтычнага і духоўнага ўдасканальвання чалавека на працягу ўсяго жыцця, паслядоўнага працэсу сацыялізацыі, інкультурацыі і індывідуалізацыі асобы.

*Адукацыйная* функцыя патрабуе пастаяннага набыцця новых ведаў, уменняў і навыкаў, павышэння ўзроўню адукаванасці чалавека, фарміравання звычкі самаадукацыі, папаўнення і паглыблення ведаў, атрыманых у афіцыйных адукацыйных установах. Усё гэта забяспечвае паўнавартаснае засваенне каштоўнасцей культуры свайго народа, грамадства і чалавецтва.

*Культураарыентуючая* функцыя рэалізуецца ў паслядоўным далучэнні асобы да свету культуры (хамінізацыя, інкультурацыя), усведамленні яе глабальнага, усёабдымнага характару, значэння і спосабаў забеспячэння культуры быту, працы, адпачынку, укараненні эстэтычных пачаткаў ва ўсе віды і формы жыццядзейнасці чалавека. Культураарыентуючая функцыя шчыльна звязана з *культуратваральнай*, якая патрабуе ўдзелу асобы ў працэсе стварэння каштоўнасцей культуры, у розных відах мастацкай, тэхнічнай, навуковай, прыкладной і сацыяльнай творчасці, грамадскай дзейнасці па ажыццяўленні сацыяльных праектаў і культуратваральных ініцыятыў. Рэалізацыя гэтай функцыі – асабліва важная задача педагога, бо вызначае далейшае развіццё культурных каштоўнасцей дзяржавы.

*Культураахоўная* функцыя прадугледжвае авалоданне асобай тэхналогіямі захавання прыроднага і культурнага асяроддзя, каштоўнасцей сусветнай і айчыннай культуры, узораў і з'яў нацыянальнай традыцыйнай культуры, забеспячэнне гармоніі ў сістэме "чалавек–прырода".

*Рэкрэацыйна-аздараўленчая* функцыя з'яўляецца найбольш спецыфічнай для сферы арганізацыі вольнага часу і патрабуе стварэння ўмоў для паўнавартаснага адпачынку асобы ў пазапрацоўны час, далучэння да розных відаў стваральнай і пазітыўнай дзейнасці. Гэта і фарміраванне святочна-абрадавай культуры, забеспячэнне відовішчна-займальнага і аздараўленчага адпачынку з

мэтай аднаўлення сіл, затрачаных на прафесійную дзейнасць, і псіхалагічная разрадка чалавека.

І апошняя, *камунікатыўная* функцыя забяспечвае рэалізацыю патрэбнасцей асобы ў паўнавартасных, змястоўных зносінах у адпаведнасці з інтарэсамі і запатрабаваннямі чалавека ў мэтах асваення культурных каштоўнасцей, фарміравання дзелавых і міжасобасных зносін, успрымання адным чалавекам другога.

Сацыякультурная дзейнасць як працэс актыўнага асваення, распаўсюджвання і стварэння культурных каштоўнасцей у канчатковым выніку арыентавана на фарміраванне культурнага асяроддзя жыццядзейнасці чалавека, распрацоўку механізмаў яго сацыялізацыі, інкультурацыі і самарэалізацыі, стварэнне тэхналогій развіцця духоўных інтарэсаў і патрэбнасцей людзей з мэтай рэалізацыі сутнасных сіл і магчымасцей чалавека. Вызначэнне, такім чынам, прадмета гэтай галіны педагагічных ведаў дазваляе гаварыць аб мікра- і макраўзроўні культурнага асяроддзя. На мікраўзроўні – сям'я, бліжэйшае атачэнне, розныя тыпы міжасобасных зносін у сацыяльных групах і суполках; на макраўзроўні – развітая сацыякультурная інфраструктура.

Сёння актыўна ідзе працэс рэфармавання дзяржаўных устаноў культуры, пераасэнсоўваюцца функцыі розных тыпаў клубных арганізацый, змест і структура іх дзейнасці, метады і формы работы з людзьмі. У гэтых умовах надзвычай важнымі падаюцца стварэнне сучаснай канцэпцыі падрыхтоўкі спецыяліста да працы ў сферы культуры, да прафесійнага кіравання і арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці, распрацоўка зместу і методыкі навучання па спецыяльнасцях прыкладной культуралогіі.

---

1. *Ариарский М.А.* Прикладная культурология. – СПб.: Санкт-Петербург. гос. ун-т культуры и искусств, 1999.— 530 с.

2. *Жарков А.Д.* Технология культурно-досуговой деятельности. – М.: Моск. гос. ун-т культуры и искусств, 1998.— 248 с.

3. *Киселева Т.Г., Красильников Ю.Д.* – М.: Моск. гос. ун-т культуры и искусств, 1995. – 135 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ